# ЛЯХАВІЦКАЯ ФАРТЭЦЫЯ: ДЫНАМІКА РАЗБУРЭННЯ ПОМНІКА Ў XIX-XXI ст.

**ПАВЕЛ БУЛАТЫ**
МАГІСТАР КІРАВАННЯ

# Сучасныя Ляхавічы – невялікі беларускі горад, цэнтр аднайменнага раёна на паўночным усходзе Брэсцкай вобласці

XV ст. Першыя згадванні ў крыніцах

да 1551 Уладанне Гаштольдаў



1551-1572 Маёмасць Жыгімонта Аўгуста



1572 Пераход ва ўласнасць Хадкевічаў



1607 Пачатак будаўніцтва фартэцыі








# Крыніцы

- Гравюра «Абарона фартэцыі ў 1660 г.»
- Інвентар цэйхгаўза
- Карэспандэнцыя Яна Караля Хадкевіча



# Ляхавіцкая фартэцыя

*Сярод падобных збудаванняў Ляхавіцкі замак лічыўся самым моцным умацаваннем ва ўсёй Рэчы Паспалітай*



На падставе гравюры апісанне фартэцыі зрабіў **Міхась Ткачоў**. Грунтуючыся на карэспандэнцыі Хадкевіча, **Мікола Волкаў** адсачыў працэс будаўніцтва замка

# Ляхавіцкая фартэцыя

**1648-1654** – асады казакоў;

**1655** – першая маскоўская асада;

**Сакавік 1660** – асада Хаванскім;

**1706-1709** – асады ў Паўночную вайну



# У 1775 г. як стратэгічна важны абарончы пункт замак перайшоў да дзяржавы, якая мела намер яго ўмацаваць. Апынуўшыся ў складзе Расійскай імперыі, Ляхавіцкая фартэцыя страціла сваё ваеннае значэнне і досыць хутка прыйшла ў занядбанне






# У 1810 г. вандроўнік У. Бранеўскі адзначыў у сваіх падарожных нататках:

*гетманскі палац, які змяшчаўся ў цэнтры, і іншыя будынкі стаялі без дахаў, сцены ад верху да нізу трэснулі і часткова развалiлiся, лесвіцы на другі паверх знізу былі разабраны. Замкавыя ўмацаванні руйнаваліся, іх каменнае аздабленне і цэглу разбіралі і прадавалі. Але на той час яшчэ стаяла вежа-брама, быў цэлы пад'ёмны мост, існавалі вадзяныя абарончыя равы, якія, аднак, паступова забалочваліся.*


ПУТЕШЕСТВІЕ

ОТЪ

ТРІЭСТА до С.-ПЕТЕРБУРГА,

въ 1810 году.

ЧАСТЬ II.

# Прасачыць дынаміку забудовы пляцоўкі, на якой знаходзілася фартэцыя дапамагаюць картаграфічныя матэрыялы XIX–XX ст.







# Першыя картаграфічныя выявы Ляхавічаў XIX ст. адносяцца да 1840-х – 1860-х гг.



# Падобнае ж адлюстравана на аналагічных картах 1850–70-х гг.



# Сітуацыя змянілася ў 1880-я г., калі праз Ляхавічы прайшлі рэйкі Палескай чыгункі



2072 4972 321 533

Для будаўніцтва выкарыстоўваліся пераважна земляныя надзелы ў межах гораду (на планах не назіраецца павелічэння даўжыні вуліц і з'яўлення новых), у тым ліку на месцы фартэцыі



# 1-вёрстка 1890-х







1910


Lachowicze
Gm.510
211,3
193
1930


ЛЯХОВИЧИ
9,1РС
0,35
202,6
пес.
1980

# У 1986 г. былі зробленыя першыя спробы археалагічнага даследавання фартэцыі





# Сучаснасць, 2016 г.




**Агулам у межах замка, на бастыёнах і часткова на замкавым рове змяшчаецца больш за 60 будынкаў розных часоў і функцыянальнай прыналежнасці**

# Замкавая пляцоўка



Замкавы роў

Дарога падзяляе пляцоўку на роўныя часткі

Месца замкавай брамы

# Замкавая пляцоўка





Заходняя курціна

Паўночна-заходні бастыён

# Замкавая пляцоўка





Знаходкі на падворках месцічаў

# Важным крокам па захаванню фартэцыі было ўсталяванне ў 1999 годзе памятнага каменя-валуна

Аднак апошні стаіць не на тэрыторыі фартэцыі, а на сотню метраў у паўднёвым напрамку ад яе, бліжэй да магістралі і моста праз р. Ведзьма. Гэта яшчэ больш блытае ўяўленне аб месцазнаходжанні славутага аб’екта, нават сярод жыхароў Ляхавічаў, якія, жывучы на тэрыторыі фартэцыі, не ведаюць аб тым.





# Помнік Ляхавіцкая фартэцыя <u>не ўключаны</u> ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь

2003

```
                    Ляхавіцкі раён

1a1M303519 Брацкая магіла                      г.Ляхавічы,      3   № 82 ад 25
                                               пл.Пабеды            лютага
                                                                    2003 г.

1a1M300719 Сядзібна-паркавы  XIX-XX ст.ст.    в.Грушаўка       2   № 71 ад 28
           комплекс:                                                лютага
```

**Ляхавіцкі раён**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 113Д000472 | Брацкая магіла | 1941–1944 гады | г. Ляхавічы, пл. Перамогі | 3 | 25.02.2003 № 82 | 14.05.2007 № 578 |
| 112Г000473 | Комплекс былой сядзібы Рэйтанаў:<br>сядзібны дом | XIX–XX стагоддзі | в. Грушаўка | 2 | 28.02.2002 № 71 | 14.05.2007 № 578 |

2009



# Такім чынам, разгледзеўшы дынаміку разбурэння помніка, можна зрабіць наступныя вынікі:

1) Сур'ёзнае разбурэнне замкавых збудаванняў назіраецца ўжо ў пач. XIX ст.

2) Да сярэдзіны XIX ст. захоўваецца і дакладна вызначаецца месца фартэцыі, а таксама, магчыма, захоўваюцца і рэшткі замкавых збудаванняў.

3) З кан. XIX ст. пачынаецца забудова замкавай пляцоўкі прыватнымі жылымі дамамі, засыпаюцца замкавыя равы.

4) З пач. XX і па сённяшні час назіраецца павелічэнне колькасці збудаванняў на тэрыторыі фартэцыі, што прыводзіць да большага разбурэння і знішчэння помніка.



**Для захавання помніка надзвычай важным і актуальным на сённяшні дзень з’яўляецца дакладнае вызначэнне тэрыторыі ўмацавання і як мага хуткае ўключэнне яго ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама рэалізацыя мерапрыемстваў па ахове помніка, для чаго павінны быць праведзены сур’ёзныя археалагічныя і археаграфічныя даследаванні гісторыі помніка.**





# ЛЯХАВІЦКАЯ ФАРТЭЦЫЯ: ДЫНАМІКА РАЗБУРЭННЯ ПОМНІКА Ў XIX-XXI ст.

**ПАВЕЛ БУЛАТЫ**
МАГІСТАР КІРАВАННЯ